На варце прыроды

# Сяргей СЕРАПІН: «Мы даўно адышлі ад дробных прыдзірак»

**Дзякуючы ўзаемадзеянню Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя з гарадскімі службамі ўсе нязначныя пытанні па добраўпарадкаванні вырашаюцца ў рабочым парадку.**

Працягваем знаёміць чытачоў з работнікамі сістэмы Мінпрыроды, чые імёны занесены на ведамасную Дошку гонару. Сёння наш суразмоўнік — **начальнік аддзела аператыўнага кантролю па Маскоўскім, Ленінскім, Цэнтральным раёнах Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргей СЕРАПІН.**

**— Шмат жыхароў сталіцы выказваюць занепакоенасць у сувязі з тым, што з двароў зніклі кантэйнеры для шкла і паперы. Што адбываецца?**

— Гэта часовыя цяжкасці. Усе старыя кантэйнеры для паперы, пластыку і шкла хутка заменяць на сучасныя, больш надзейныя, добра абароненыя ад знешніх фактараў. Мінскі гарадскі камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя фінансава ўдзельнічае ў гэтым праекце. Таксама цяпер сумесна з раённымі службамі ЖКГ прапрацоўваем пытанне аб устаноўцы ў Мінску заглыбленых кантэйнераў для цвёрдых бытавых адходаў. Яны значна зручнейшыя, больш ёмістыя і эстэтычныя, чым тыя, што выкарыстоўваюцца цяпер.

**— Што можна сказаць пра экалагічнае становішча на вашай падведамаснай тэрыторыі?**

— Ленінскі і Цэнтральны раёны — самыя экалагічна чыстыя з зоны маёй адказнасці. Вы скажаце, што, напрыклад, у Цэнтральным раёне размешчаны завод «Атлант». Адкажу, што гэта прадпрыемства, якое надзвычай адказна ставіцца да пытанняў экалагічнай бяспекі і па праве занесена на гарадскую Дошку гонару. Наш самы вялікі клопат у гэтых раёнах — рака Свіслач. Раз на месяц робім абыход на прадмет выканання патрабаванняў водаахоўнага заканадаўства.

Маскоўскі раён больш складаны, у ім шмат прамысловых прадпрыемстваў. Насельніцтва асабліва турбуюць шкодныя выкіды, і таму гэтае пытанне заўсёды ў нас на кантролі. Ды і самі прадпрыемствы праяўляюць свядомасць, выдаткоўваюць сродкі на абнаўленне газаачышчальных сістэм. У сваёй інспектарскай дзейнасці мы даўно адышлі ад дробных прыдзірак. Наладжана ўзаемадзеянне з гарадскімі службамі, усе нязначныя пытанні вырашаюцца на месцы.

**— Ва ўсіх трох раёнах ёсць прыватны сектар. На першы погляд, гэта ў асноўным дыхтоўныя дамы, дагледжаныя ўчасткі. А што выяўляецца падчас абследавання жылых тэрыторый?**

— У прыватным сектары пакуль яшчэ застаюцца асобныя праблемы з санітарным станам участкаў, нясвоечасовым вывазам адходаў і іх складзіраваннем у несанкцыянаваных месцах. Так ці інакш, гэта вырашальная праблема: дзесьці хапае растлумачальнай працы, дзесьці просім мясцовыя службы ЖКГ перагледзець графік вывазу смецця. У прыватным сектары практычна нідзе няма стацыянарных пляцовак для збору адходаў. Таму людзі выкладваюць пакеты па ходзе руху смецця-воза. Злосных парушальнікаў няшмат, але кожны з іх наносіць каласальную шкоду прыродзе. Напрыклад, падчас рэйду ў раёне старой прыватнай забудовы мы выявілі майстэрскі замаскіраваную трубу антысептыку, якая выходзіла проста ў Свіслач. Вядома, склалі пратакол, паводле рашэння суда на гаспадара дома быў накладзены штраф. У гэтай гісторыі мяне да бясконцасці здзіўляе эгаізм. Чалавек не думае пра суседзяў, дык хаця б падумаў пра тое, што на беразе забруджанай ракі будуць жыць яго дзеці і ўнукі.

**— Якія яшчэ пытанні ў полі зроку аддзела аператыўнага кантролю?**

— Вядзецца сістэмны кантроль за выкананнем заканадаўства ў галіне абыходжання з адходамі, у тым ліку за недапушчэннем іх захавання на палігонах. Акрамя абследавання жылых тэрыторый выяўляем несанкцыянаваныя звалкі адходаў на тэрыторыі агульнага доступу, у прыдарожных палосах, месцах адпачынку. На кантролі ў нас таксама пытанні ўладкавання месцаў збору адходаў з тэрыторыі могілак, прывядзенне ў належны стан мемарыяльных комплексаў. Супрацоўнікі камітэта прымалі ўдзел у суботніку на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Малы Трасцянец» у межах кампаніі «Уладкуем малую радзіму!».

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**
**Фота аўтара.**

Падводзім вынікі

# Зорны час для крэатыўных

**Часопіс «Родная прырода» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя сумесна з Міністэрствам адукацыі падвялі вынікі рэспубліканскага экалагічнага конкурсу ідэй «Прырода малой радзімы».**

На рэдакцыйную пошту прыйшло больш за 80 работ ад устаноў адукацыі з розных куткоў Беларусі. Забруджванне паветра, глеб і водных рэсурсаў, праблема адходаў, барацьба з інвазійнымі раслінамі і жывёламі, азеляненне і добраўпарадкаванне населеных пунктаў — тэмы, па якіх працавалі ўдзельнікі конкурсу, былі розныя. Аб'яднала іх любоў да роднай зямлі і імкненне агульнымі намаганнямі зрабіць яе экалагічна чыстай, прывабнай для турыстаў і ўтульнай для мясцовых жыхароў.

**Хто ж стаў пераможцам?**
**Сярод калектыўных работ тройка лідараў наступная:**

**1-е месца** — «Распрацоўка 3D-атласа «Развіццё экалагічнага турызму на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях Гродзенскай вобласці», аўтары — Ксенія Сідаровіч і Ілья Гульнік, Едкаўская сярэдняя школа, Лідскі раён Гродзенскай вобласці;

**2-е месца** — «Папера з трыснягу», аўтары — удзельнікі навуковага таварыства вучняў па хіміі, сярэдняя школа № 2 г. п. Зэльва, Гродзенская вобласць;

**3-е месца** — экалагічны праект «100 %», аўтары — удзельнікі клуба ЮНЕСКА «Шок», сярэдняя школа № 9 г. Брэста.

**Сярод індывідуальных работ пераможцы:**

**1-е месца** — «Аўтаномны вулічны ліхтар для горада Брэста з гарызантальным ветрагенератарам і сонечнымі панэлямі», аўтар — Цімафей Авярчук, сярэдняя школа № 13 г. Брэста імя В. І. Хована;

**2-е месца** — экалагічная акцыя «Уцёкі з агародчыка», аўтар — Іна Бука, гімназія г. Буда-Кашалёва, Гомельская вобласць;

**3-е месца** — даследчая работа «Тайны смеццевага вядра», аўтар — Ганна Заяц, сярэдняя школа № 1 г. Петрыкава, Гомельская вобласць.

Мы сардэчна віншуем аўтараў работ з перамогай і запрашаем у Выдавецкі дом «Звязда» па падарункі. Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па нумары 8 (017) 263-84-61.

Работы пераможцаў рэспубліканскага конкурсу ідэй «Прырода малой радзімы» можна прачытаць на старонцы часопіса «Родная прырода» http://zviazda.by/be/edition/rodnaya-pryroda, а таксама ў снежаньскім нумары выдання.

Спадзяёмся, ідэі, выказаныя пераможцамі, рэалізуюцца не толькі на іх малой радзіме, але і ў іншых рэгіёнах Беларусі, стануць перадумовай для паляпшэння экалагічнай сітуацыі ў краіне.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

Чысты горад

# НА ВАГУ І НА РАЗЛІЎ

## У Мінску запрацавала «безадходная» карта

**Грэчка на вагу і бытавая хімія ў сваю бутэльку — у сталіцы па ініцыятыве Цэнтра экалагічных рашэнняў з'явілася Zero waste карта, якая дапаможа мінчанам утвараць менш адходаў. Паўдзельнічаць у яе распрацоўцы можа кожны ахвотны!**

На безадходнай карце сабраны месцы, дзе можна купіць тавары без упакоўкі, а таксама шматразовыя альтэрнатывы аднаразовым рэчам (напрыклад, мяшочкі з тканіны для садавіны і агародніны альбо драўляныя вушныя палачкі замест пластыкавых). Пры гэтым чакаецца, што заносіць такія месцы на карту будуць звычайныя людзі — такім чынам, ужо сёння любы чалавек можа зрабіць важны крок на шляху да экалагічна дружалюбнага ладу жыцця.

— Ідэя праекта ляжала на паверхні, — расказала каардынатар Zero waste карты, супрацоўніца Цэнтра экалагічных рашэнняў Таццяна Кузняцова. — Нядаўна ў нас у «тэлеграме» з'явіўся чат, дзе кожны можа нешта спытаць альбо нечым падзяліцца. І вось самае папулярнае пытанне датычылася якраз безадходных пакупак. Такія запыты пастаянна паўтараліся, і мы вырашылі: а чаму б не скласці карту, дзе ўсё будзе структуравана і зразумела.

Карыстацца Zero waste картай няцяжка: там ёсць некалькі слаёў і маркёраў, якія дапамогуць зарыентавацца. Цяпер вы можаце знайсці альбо занесці на рэсурс наступныя катэгорыі: бакалею (макароны, крупы, муку і г. д.), розныя прысмакі (вафлі, зефір, цукеркі і г. д.), бытавую хімію, касметыку — зразумела, усё гэта павінна прадавацца без упакоўкі, нават папяровай. Таксама на карце ёсць катэгорыі тавараў і месцаў, якія дапамогуць замяніць розныя рэчы на больш экалагічны варыянт. Гэта, напрыклад, экатавары (шматразовыя трубачкі), ежа на вынас альбо адзенне (сэканд-хэнды ці дабрачынныя крамы). Яшчэ на карце вы можаце ўбачыць нетыповую катэгорыю пад назвай «Пакет free магазіны» — сюды арганізатары прапануюць заносіць магазіны, якія без праблем прадаюць тавары ў сваю ўпакоўку.

— На жаль, сёння некаторыя пакупнікі сутыкаюцца з такімі сітуацыямі, калі ім не хочуць адпускаць вагавую прадукцыю ў сваю тару. У асноўным прадаўцы спасылаюцца на заканадаўства і санітарна-гігіенічныя нормы, але мы высветлілі, што нідзе няма прамой забароны на выкарыстанне свайго пакета альбо кантэйнера пры ўмове, што яны чыстыя, вядома. У такіх выпадках мы прапануем пытаць у супрацоўнікаў канкрэтны пункт закона і што там напісана, — падкрэсліла Таццяна.




Але бываюць выпадкі, калі выкарыстоўваць толькі аднаразовую тару — палітыка магазіна, тут ужо трэба рэкамендаваць, каб яна была перагледжана.

— У адзін са сталічных магазінаў мы звярнуліся з такой просьбай і атрымалі пісьмовы адказ, дзе начальства пацвердзіла — у іх можна пакласці прадукты ў сваю тару. Форму звароту мы размясцілі на нашым сайце, — адзначыла спецыяліст.

Каб Zero waste карта была карыснай і сапраўды безадходнай, каардынатары праекта рэкамендуюць прытрымлівацца некаторых правіл. Напрыклад, не заносіць на яе прадукты, якія прадаюцца без упакоўкі ў кожным магазіне (садавіну, агародніну), альбо шматразовыя тавары, якія вельмі распаўсюджаны (тэрмакубкі, экаторбы і г. д.), а таксама экалагічную касметыку і хімію нават з добрым складам, але ў аднаразовай тары. Што датычыцца сэканд-хэндаў, то лепш пісаць, чым ён адрозніваецца ад іншых.

— Сёння экалагічна свядомых людзей становіцца ўсё больш, — падкрэсліла Таццяна Кузняцова. — Менавіта дзякуючы іх запытам і з'явілася наша карта. Магчыма, шмат каго натхніла Беа Джонсан (zero waste актывістка), якая не так даўно прыязджала і ў Беларусь.

**Кацярына ЦІТОВА.**

**Шукайце Zero waste карту па спасылцы https://ecoidea.by/ru/zerowaste.**